**УДК 821.161.3-312.4*Л.Рублеўская**

***К. Г. Навуменка***

# ПРЫКМЕТЫ МІСТЫЧНАГА ДЭТЭКТЫВА Ў РАМАНЕ “ПАНТОФЛЯ МНЕМАЗІНЫ” ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ

*Артыкул прысвечаны вызначэнню жанравай спецыфікі твора “Пантофля Мнемазіны” Л. Рублеўскай. Аўтарам акрэслена паняцце “дэтэктыў” і яго літаратуразнаўчае напаўненне, вызначаны спосабы ўвасаблення містычнага пачатку ў рамане пісьменніцы, а таксама разгледжана сістэма мастацкіх вобразаў, якія дапамагаюць стварыць адпаведную атмасферу. Зроблена выснова, што раман “Пантофля Мнемазіны” ўяўляе сабой узор класічнага дэтэктыва з містычнымі элементамі, большасць з якіх у фінале атрымлівае рацыянальнае вытлумачэнне.*

Дэтэктыў, або крымінальны аповед (ад лац. *detectio* – раскрыццё), – літаратурны і кінематаграфічны жанр, творы якога апісваюць працэс даследавання злачынства з мэтай высвятлення яго абставінаў і раскрыцця загадкі. Абавязковымі складнікамі дэтэктыва з’яўляюцца загадкавае здарэнне, расследаванне, што вядуць галоўныя героі, разгадка з тлумачэннем падзей, а таксама падказкі, якія чытач атрымлівае па ходзе аповеду. Наяўнасць доказаў, якія дазваляюць рэцыпіенту самастойна раскрыць сакрэт, з’яўляецца абавязковай умовай класічнага дэтэктыва. Гэты жанр мае некалькі разнавіднасцей: гістарычны, іранічны, шпіёнскі, псіхалагічны, палітычны, інтэлектуальны і шэраг іншых, – але ў кантэксце нашага даследавання асаблівую цікавасць уяўляе фантастычны дэтэктыў. Творы такога паджанру ў дадатак да вышэй пералічаных рыс маюць прыкметы фэнтэзі, хорару, містыкі і пад. Дзеянне адбываецца ў альтэрнатыўным мінулым ці будучым або ў свеце, створаным уяўленнем аўтара. Містычны, альбо акультны, дэтэктыў таксама сумяшчае ў сабе адметнасці крымінальнага аповеду і звышнатуральныя элементы. Падзеі ў такім творы нярэдка звязаны з магіяй, вурдалакамі, прывідамі і іншымі хтанічнымі істотамі.

Дэтэктыў нярэдка адносяць да формульных жанраў. Л. Алейнік у артыкуле “Масавая літаратура: сябар ці вораг” сцвярджае, што поп-культура сфарміравала “дакладны звод «канонаў» – мадэль, што забяспечвае спецыфічную прагназаванасць развязкі, таму чытач амаль ніколі не застаецца расчараваным: злачынца заўсёды пакараны, жанчына-пакутніца знаходзіць сваё каханне і г. д.” [1]. Тым не менш не ўсе творы згаданага жанру маюць нізкі мастацкі ўзровень, належаць да паралітаратуры. Яркім прыкладам якаснай белетрыстыкі могуць служыць дэтэктывы сучаснай беларускай пісьменніцы Л. Рублеўскай.

Раман пісьменніцы “Пантофля Мнемазіны” пабачыў свет у 2018 годзе. У аснову сюжэта пакладзена перапляценне віртуальнага, мінулага і сучаснага. Разблытваннем клубка дэтэктыўных падзей займаецца галоўная гераіня, Ірына Корвус (Вірынея Нарушэвіч). Дзяўчына праштрафілася перад начальствам, за што яе адправілі далей ад рэдакцыі ў “вольны куток службы бяспекі” [2, с. 6]. Акрамя гэтага, гераіня з’яўляецца мадэратарам сайта фанфікшн пад назвай “Пад знакам Урабораса”. Аднойчы на працы ў маніторы Ірына пабачыла свайго мужа. Здавалася б, што з гэтай сітуацыяй не так? Але Віталь Корвус, муж Вірынеі, загінуў сем гадоў таму праз шэсць дзён пасля вяселля, цела яго так і не знайшлі. Гэтая нечаканая сустрэча пацягнула за сабой ланцуг дэтэктыўных падзей, якія гераіня спрабуе растлумачыць.

Пасля гэтай нечаканай і нават містычнай сустрэчы ёй ананімна дасылаюць першы раздзел новага фанфіка пад назвай “Ордэн захавальнікаваў”, які распавядае пра жыццё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Люцыяна Корвуса і яго сяброў-вучняў. Аднак тэкст фанфіка мае ў рамане большыя функцыі, чым проста ўстаўная навела. Сюжэт твора даволі цікавы. З'яўляючыся настаўнікам біялогіі, Люцыян Станіслававіч вёў гістарычны гурток пад назвай "Ордэн захавальнікаў". У складзе гуртка былі Малгажата Ракуцкая, Рэм Цвічок, Рыгор Самусь і Яўгенія Равіновіч, якія займаліся раскопкамі. Аднойчы ў іх працэсе сябры знайшлі невялікае пасяленне для смяротна хворых, якіх адсялілі са Старавежску. Калі пачалася вайна, гурток распаўся, а маладыя людзі пайшлі ў партызаны, былі падрыўнікамі, а Жэнька – сувязной. Падзеі развіваюцца даволі драматычна: сябры трапілі ў палон да немцаў, якія палічылі Жэньку габрэйкай. Корвусу, які, нібыта па загадзе, працаваў перакладчыкам пры нямецкім штабе, удалося пераканаць ворагаў, што дзяўчына – беларуска. Партызанаў катаваталі і шантажыравалі здароўем і жыццём Жэнькі, імкнучыся даведацца пра месцазнаходжанне іх атрада. Але сябры з годнасцю вытрымалі выпрабаванне. Пасля вайны Рыгор стаў маёрам КДБ, Малгося і Жэнька – студэнткамі медінстытута, Рэм з дапамогай Самуся ўладкаваўся на ваенны склад, Рыгор і Яўгенія ажаніліся (але праз некаторы час Яўгенія збегла/паехала працаваць у Казахстан), а Люцыян Станіслававіч абараніў доктарскую і стварыў уласную лабараторыю. Пасля таго, як на былога кіраўніка гуртка "Ордэн захавальнікаў" завялі справу ў выніку нанесенай абразы вядомаму прафесару Лепяшынскай, шляхі сяброў зноў сышліся, але вельмі дзіўным чынам. Лабараторыю расфарміравалі, супрацоўнікаў беспрычынна арыштавалі, а самога Корвуса саслалі "на Палессе, таксама ў лабараторыю, але ўжо не навуковую, а тую, куды савецкія грамадзяне па накіраванні «жывыя рэчы» здаюць у бутэлечках ды карабках ад запалак" [2, с. 20]. Справу на Люцыяна Станіслававіча ўласнаручна завёў маёр Рыгор Самусь, які пры сустрэчы пабіў былога настаўніка да непрытомнасці за "супрацоўніцтва" з немцамі.

Пасля прачытання дзяўчынай фанфіка плынь містычных, загадкавых падзей у яе жыцці павялічылася. Жанчына, якая збірала грошы ў вагоне, нечакана сказала Ірыне досыць дзіўныя словы: "Што лупішся? <…> Будзеш, красунька, з нябожчыкам цалавацца!" [2, с. 25]. Менавіта гэты момант з'яўляецца дэтэктыўнай падказкай для чытача, можа наштурхнуць яго на думку, што Віталь не памёр, а знік, бо хаваецца ад небяспекі.

Пасля нечаканай сустрэчы з "прывідам" мужа Ірына вырашае наведацца да цёткі Віталя, тым больш тая заўсёды пры размовах звала да сябе і згадвала, што яе пляменнік пакінуў для жонкі нейкі пакет. Гэта становіцца чарговым доказам у ланцугу загадкавых падзей. Пакет прыводзіць Вірынею ў Старавежск, дзе, па словах "памерлага" мужа, ёсць нерухомасць, якая належыць дзяўчыне. Віталю яна адышла ад сваяка, але ён перапісаў яе на жонку – гэта павінна было стаць невялічкім сюрпрызам пасля вяселля.

У "сваім" доме Ірына і яе спадарожнік Мацей сустракаюць сіямскіх блізнюкоў і даведваюцца, што гэта дом героя згаданага вышэй фанфіка Люцыяна Корвуса. Загадкі толькі нарошчваюцца, бо ніякіх дзяцей, а тым больш унукаў, як сведчыў тэкст, у Люцыяна Станіслававіча не было. У эпізодзе сустрэчы з жыхарамі памесця адбываецца сутыкненне мінулага і сучаснага. Персанаж фанфіка аказваецца рэальнай асобай, а сам фанфік "Ордэн захавальнікаў" – сапраўдным жыццяпісам.

Тут жа Вірынея ўбачыла чарговую, на гэты раз цалкам рэалістычную, падказку, якая дае ёй надзею, што яе муж, магчыма, жывы. Дзяўчына знаходзіць аб'яву аб продажы гішпанскай сантэхнікі, а Віталь перад сваёй смерцю меў намер прывезці з Польшы парцалянавы ўнітаз. На лістоўцы з аб'явай указаны адрас, трапіўшы па якім, Вірынея ўрэшце сустракае прывіда-нябожчыка – свайго нібыта памерлага мужа.

Асаблівага містычнага каларыту ўсёй гэтай гісторыі дадае чорны сшытак з зашыфраванымі запісамі, у якім, па словах ілжэ-Корвуса, знаходзіцца сакрэтны рэцэпт бессмяротнасці, які вынайшаў Люцыян Станіслававіч. Тут у сумесь мінулага і сучаснага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дадаецца і віртуальны свет. Каб дэкадзіраваць запісы, напісаныя на штучнай мове – эсперанта, Мацей вырашае скарыстацца сакрэтнай распрацоўкай – праграмай "Агата", якой па сілах расшыфраваць напісанае.

Разам з тым навуковы пачатак у тэксце рамана мяжуе з магічным. Люцыяну Корвусу ўдалося вынайсці своеасаблівы філасофскі камень – эліксір неўміручасці. Пры асабістай сустрэчы Корвус тлумачыць Вірынеі ўсе загадкавыя падзеі, якія сустракаліся па ходу сюжэта. Люцыян распавёў, што яго жонка хварэла на рак і, каб яе вылячыць, ён і пачаў эксперыменты с магрэткай. Таксама расказаў, што гэта ён даслаў фанфік Ірыне, а ў чорным сшытку знаходзіцца жыццяпіс Люцыяна і Яўгеніі Корвус. Акрамя гэтага, адкрылася загадка невытлумачальнага знешняга падабенства Ірыны і Жэнькі: пасля катаванняў і высылкі ў Сібір Яўгенія не магла зацяжарыць, але Люцыян змог замарозіць яе яйцаклеткі, такім чынам яна стала донарам для маці Вірынеі. Таямнічыя вобразы, якія дзіўным чынам захоўваюцца ў памяці Ірыны, – вынік эксперыментаў Корвуса з душой яго жонкі.

Такім чынам, раман "Пантофля Мнемазіны" з'яўляецца прыкладам класічнага дэтэктыва з дамешкам містычных элементаў, большасць з якіх знаходзіць цалкам рацыянальнае і лагічнае вытлумачэнне ў фінале твора. З аднаго боку, тут прысутнічае характэрны сюжэтнай формуле ланцуг таямнічых падзей: загадка→ пошук ісціны → разгадка → шчаслівае каханне. З другога – пісьменніца ўздымае і глыбока раскрывае ў рамане сур'ёзныя нацыянальныя і гістарычныя праблемы, што выводзіць твор па-за межы трывіяльнай літаратуры.

**Літаратура**

1 Алейнік, Л. Масавая літаратура: сябар ці вораг [Электронны рэсурс] / Л. Алейнік. – Рэжым доступу : https://lit-krytyka.livejournal.com/24482.html. – Дата доступу : 21.04.2022.

2 Рублеўская, Л. Пантофля Мнемазіны (пачатак) / Людміла Рублеўская // Дзеяслоў. – 2017. – № 4 (89). – С. 5–81.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ